Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЛІПЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 144 (28254)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Паветра краіны палепшыцца

СТАР. 2

Знаёмыя галасы ў Рыа

СТАР. 5

Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ

Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:

«Большасць прадпрыемстваў краіны эфектыўна працуюць, рэзультатыўна спраўляючыся з эканамічнымі цяжкасцямі. Але і паспяховым прадпрыемствам нельга запавольваць тэмпы развіцця і страчваць нават невялікія рынкі збыту. Канкурэнцыя на знешніх рынках настолькі высокая, што калі цябе крыху адсунулі з нейкай пазіцыі, то ў далейшым могуць наогул выцесніць з нішы, якую ты займаў. А гэта пагражае стратай рынку збыту ў пэўнай краіне, а можа нават і ў рэгіёне. Трэба ўсяляк утрымліваць заваяваныя пазіцыі. Часовыя цяжкасці, я думаю, мы ў наступныя гады 2-3 пераадолеем, і краіна выйдзе на тыя тэмпы эканамічнага росту, якія былі ў нас 5 гадоў таму».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.07.2016 г.

Долар ЗША	1,9889	▼
Еўра	2,2089	▲
Рас. руб.	0,0300	▼
Укр. грыўня	0,0801	▼

ISSN 1990 - 763X

Ткачова ткацтва

Жыхар вёскі Стрэнькі Рагачоўскага раёна Арцём ТКАЧОЎ тчэ ручнік на кроснах сваёй прапрабабкі. Ткацкаму станку больш за 200 гадоў, ён стаіць у раённым Цэнтры рамёстваў. Арцём не толькі авалодаў сакрэтамі традыцыйнага ткацтва, ён вядзе студыю керамікі, робіць пластыку і займаецца ганчарствам. Па прыкладзе сваіх бацькоў, майстроў дэкаратыўнага мастацтва, Арцём вырашыў прысвяціць сябе народнаму мастацтву і рамёствам — ён студэнт-завочнік трэцяга курса Віцебскага педагагічнага ўніверсітэта.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Здаровае харчаванне

ШТО БУДЗЕМ ЕСЦІ?

Міфы аб харчаванні і розных «паляпшальніках» здароўя гуляюць па інтэрнэт-прасторы з зайздросным пастаянствам

Што ўключае ў сябе паняцце «здаровае харчаванне»? Тэма гэта аб'ёмная і неверагодна цікавая. І вельмі важная для беларусаў, нацыянальная кухня якіх далёкая, па сутнасці, ад таго, што сёння спецыялісты называюць гэтым словазлучэннем... Адказ на пастаўленае пытанне пашукаем разам з дырэктарам Цэнтра аздараўленчага харчавання і садзейнічання здароўю, доктарам медыцынскіх навук Элеанорай КАПІТОНАВАЙ.

— Здаровае харчаванне — гэта ежа, якая забяспечвае максімальны ўзровень здароўя чалавека. Спажыўныя рэчывы даюць арганізму энергію, а таксама служаць будаўнічым матэрыялам для аднаўлення затрачаных рэсурсаў. У арганізме пастаянна адбываюцца працэсы разбурэння старых кампанентаў і будаўніцтва новых — ім на замену. Для гэтага бесперапыннага працэсу распаду і сінтэзу і патрэбны ўсе рэчывы, якія чалавек атрымлівае з ежы, вады і паветра.

— Што адбываецца, калі штосьці ў рацыёне пераважае? Як можна ацаніць з гэтай пазіцыі харчаванне беларусаў?

— Бялкі, тлушчы і вугляводы — гэта асноўныя спажыўныя рэчывы, якія змяшчаюцца ў ежы, і яны павінны паступаць у арганізм штодня. Кожны з гэтых кампанентаў выконвае самыя разнастайныя функцыі, якія заключаюцца не толькі ў забеспячэнні арганізма энергетычным і будаўнічым матэрыялам. Напрыклад, некаторыя бялкі служаць у якасці «перавозчыкаў« для іншых рэчываў — вітамінаў, многіх мінералаў, дастаўляючы іх да «месца прызначэння»; тлушчы з'яўляюцца асновай важных гармонаў; без вугляводнага кампанента «заржавелі» б нашы суставы... Але калі гаварыць толькі пра спажыўную каштоўнасць асобных кампанентаў ежы, то важна разумець, што для дасягнення максімальнага ўзроўню здароўя бялкі, тлушчы і вугляводы павінны паступаць у арганізм у пэўных суадносінах, розных для кожнага ўзроставага перыяду жыцця.

СТАР. 4

■ Наш стандарт

Сэрвіс уздоўж дарогі

Выжываюць тыя, хто гатуе смачней і ўсміхаецца шырэй

Для развіцця прыдарожнага сэрвісу вельмі важна ўменне работнікаў аб'ектаў грамадскага харчавання валодаць мовамі. Бо многія з тых, хто спыняецца на адпачынак, — кіроўцы фур і замежныя турысты. З гэтай прычыны кавярні абавязваюць мець меню на дзвюх мовах, у тым ліку на замежнай. Не лішняй будзе і сувенірная прадукцыя на памяць пра Беларусь.

Згодна са стандартам, на кожных 30-50 кіламетрах дарогі павінен знаходзіцца аб'ект грамадскага харчавання. У нас ён, у прынцыпе, выконваецца, аднак гэта не азначае, што такія аб'екты знаходзяцца менавіта праз 30 кіламетраў адзін ад аднаго. Бо размясціць іх так дакладна не заўжды дазваляе мясцовасць, або гэта ўвогуле немэтазгодна. Тым не менш сёння іх пры дарогах дастаткова.

СТАР. 4

Фота БЕЛТА.

Дабіцца належнага выніку

Прэзідэнт заклікае знайсці новыя падыходы ў барацьбе з праблемай курэння

Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе па пытаннях абароту і спажывання тытунёвых вырабаў і электронных сістэм курэння, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.

«Мы бачым, што людзі па-ранейшаму кураць, і адных забаронных мер недастаткова, — адзначыў Прэзідэнт. — Не сакрэт, што забаронены плод заўсёды салодкі для пачынаючых курцоў. А курцам са стажам патрэбна моцная матывацыя для адмовы ад курэння. Настаў час для пошуку новых шляхоў вырашэння гэтай праблемы, якія будуць улічваць рэальны стан спраў і псіхалогію людзей».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сусветны вопыт і практыка паказваюць, што для дасягнення выніку патрэбны не татальныя забароны, а прадуманы комплекс мер. «Адміністрацыйныя абмежаванні павінны арганічна спалучацца з рознымі стымуламі, заахвочваннямі і інфармацыйнай работай. Асноўная роля тут адводзіцца медыкам, журналістам, педагогам, ідэолагам», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, у Беларусі праблема спажывання тытунёвых вырабаў застаецца сур'ёзнай. Нягледзячы на меры, што прымаюцца, у краіне курыць амаль палавіна мужчынскага насельніцтва, усё часцей гэту згубную прывычку мае моладзь. «Больш таго, з'яўляюцца новыя прадукты для імітацыі курэння, што наносяць не меншую шкоду здароўю, чым тытунь. Размова ідзе аб электронных цыгарэтах, якія становяцца ўсё больш папулярнымі. Яны прыцягваюць сваёй незвычайнасцю, даступнасцю, адсутнасцю інфармацыі аб шкодзе іх выкарыстання. Ды і не ўсе згаджаюцца з тым, што яны шкодныя настолькі, наколькі шкодныя традыцыйныя цыгарэты», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што падставай для гэтай размовы стаў праект дэкрэта, які ўнесены на яго разгляд. «Дакумент сур'ёзны. Я яго павінен разгледзець і падпісаць. Але палічыў неабходным па праблемах, якія адносяцца да праекта гэтага дэкрэта, яшчэ раз параіцца, вярнуўшыся ў цэлым да пытанняў вытворчасці і спажывання тытунёвых вырабаў», — заявіў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што дэкрэт, прызначаны знізіць спажыванне тытуню жыхарамі Беларусі, быў прыняты яшчэ ў 2002 годзе, і неабходныя змяненні ўносяцца ў яго рэгулярна. «Але належнага выніку, на які мы разлічвалі, пакуль няма. Таму, па-першае, нам трэба прааналізаваць, як выконваюцца палажэнні дэкрэта ў дзеючай рэдакцыі і якіх зрухаў удалося дасягнуць. Па-другое (аб адказных за рэалізацыю яго норм), наколькі эфектыўна мы адсочваем вынікі праводзімай работы?» — паставіў пытанні кіраўнік дзяржавы.

Новым праектам дэкрэта, у прыватнасці, прапануецца прыраўнаваць электронныя цыгарэты да тытунёвых вырабаў і пашырыць пералік месц, у якіх курэнне забараняецца. «Аднак паўстае пытанне, ці прынясуць гэтыя меры чаканы эфект? — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы павінны абмеркаваць, ці ўсё прадугледжана ў праекце дэкрэта, ці ёсць альтэрнатыўныя шляхі для зніжэння тытунекурэння ў Беларусі?»

Міністр аховы здароўя Васіль Жарко на нарадзе расказаў, што спажыванне тытуню наносіць істотную шкоду здароўю грамадзян, а гэта, у сваю чаргу, кладзецца цяжарам на грамадства і дзяржаву. «Тытунекурэнне з'яўляецца адным з асноўных фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў, іх ускладненняў і заўчаснай смяротнасці», — падкрэсліў ён.

Паводле даных міністра, у Беларусі на долю неінфекцыйных захворванняў прыпадае каля 86 працэнтаў усіх хвароб і 82 працэнты смерцяў. «У 2015 годзе смяротнасць мужчын працаздольнага ўзросту перавышала значэнне аналагічнага паказчыку ў жанчын у 4 разы. А па асобных прычынах — хваробы сістэмы кровазвароту, злаякасныя новаўтварэнні — да 7 разоў. У тытунёвым дыме знаходзіцца больш за 90 вядомых канцэрагенаў і каля 250 таксічных злучэнняў», — сказаў Васіль Жарко.

■ Пра гэта гаварылася на сходзе

ПРАЕКТ... СТРАЦІЎ АКТУАЛЬНАСЦЬ

Чаму не заўсёды даюць эфект інавацыйныя сродкі дзяржаўнай падтрымкі?

Пытанні эканомікі, інвестыцый у актуальныя праекты, скіраваныя на выпуск канкурэнтнай прадукцыі і стварэнне новых рабочых месцаў, сёння для краіны ключавыя. Прычым задача не толькі ў прыцягненні замежнага капіталу, але і ў эфектыўным выкарыстанні сродкаў дзяржаўнай падтрымкі. Ці заўсёды яны трацяцца прадумана? На жаль, не, у чым пераканаўся Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці, прааналізаваўшы, як прадпрыемствы харчовай галіны выкарысталі сродкі дзяржпадтрымкі на тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці.

У 2013 годзе Слонімскі вінна-гарэлачны завод распачаў рэалізацыю праекта па арганізацыі вытворчасці пладовых дыстылятаў і на іх аснове высакаякасных алкагольных напояў, у тым ліку кальвадосаў. Перспектыва, мусіць, яго ініцыятарам здавалася някепскай, аднак не ўлічылі «дробязь», што такой жа прадукцыяй могуць заняцца і іншыя. З рашэннем аб фінансаванні гэтага інвестпраекта прамарудзілі, і ён... страціў сваю актуальнасць. У 2015 годзе Пінскі вінаробны завод рэалізаваў падобны праект, цалкам забяспечыўшы патрэбу беларускага рынку ў пладовых гарэлцы, брэндзі і кальвадосах. А ў Слоніме набытае абсталяванне магутнасцю 300 тыс. дал у год летась загрузілі толькі на 19%. Пры гэтым на праект затрачана 6271,8 млн рублёў, у тым ліку 563 млн руб. сродкаў інавацыйнага фонду Гродзенскага аблвыканкама. У выніку аблвыканкам прыняў рашэнне аб вяртанні гэтай сумы, плюс яшчэ 250,4 млн руб. пені.

Неаднойчы анансаваўся журналістам і яшчэ адзін праект — па стварэнні на Навагрудскім вінзаводзе вытворчасці і разліву ў ПЭТ-бутэлькі квасу браджэння, безалкагольных напояў на аснове рысавага грыба з рэалізацыяй прадукцыі на знешнім рынку. Агульныя затраты склалі 11,5 млрд рублёў, у тым ліку 2145,1 млн рублёў — з інавацыйнага фонду Гродзенскага аблвыканкама. Як жа працуе новая лінія? У 2014 годзе яе магутнасць выкарысталі на 15,4%, летась — на 17,9%.

Бывае і так, што прымаюць непрадуманыя рашэнні па замене часткі абсталявання, трацяць вялізныя грошы, а эфектыўнасць работы лініі ў цэлым не паляпшаецца. Так здарылася на Гродзенскім кансервавым заводзе, дзе на мадэрнізацыю лініі па вытворчасці зялёнага гарошку затрацілі 3,4 мільёна еўра, але запланаванага выніку не дабіліся. Чаму? Бо не замянілі абсталяванне па падрыхтоўцы гэтай прадукцыі, дзе асобныя машыны ўжо стапрацэнтна зношаны. Таму прадукцыйнасць лініі не павялічылася адпаведна праектным рашэнням да 4,5 тон у гадзіну, а фактычна складае на сённяшні дзень 1,3 т/г.

Зрэшты, не заўсёды замена абсталявання дае эфект. Слонімскі вінна-гарэлачны завод за 2050 млн рублёў набыў стужкавы прэс германскай вытворчасці, які ўжо быў у карыстанні. У 2014 годзе на ім перапрацавалі 5824 тоны яблыкаў, а летась — 4211 тон, альбо 75% ад узроўню 2013-га, калі выпрацоўка соку вялася на старым, менш прадукцыйным абсталяванні.

Усе гэтыя праекты, вядома, падмацоўваліся бізнес-планамі, аднак ці ўсё дакладна пралічылі пры іх распрацоўцы? І калі яны падтрымліваюцца з дзяржаўнага інавацыйнага фонду, то наколькі грунтоўна прааналізавалі гэтыя планы на ўзроўні выдзялення сродкаў дзяржпадтрымкі? Гэта тычыцца не толькі аб'ёмаў вытворчасці, а найперш перспектыў рэалізацыі тавару. Ці былі праведзены прадпрыемствам даследаванні рынкаў збыту прадукцыі, якую маюць намер вырабляць? Ці ёсць дамоўленасці з яе патэнцыяльнымі пакупнікамі і наколькі яны рэальныя? Вось, пэўна, што прынцыпова і абавязкова патрэбна ўжо на стадыі распрацоўкі праекта.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

■ Выбары-2016

Настрой маёй краіны

На скрыжаванні дарог, каля двух вакзалаў у Гомелі, правялі пікет па зборы подпісаў у падтрымку прэтэндэнта ў кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў актывісты БРСМ.

Фота БЕЛТА.

Грамадзянска-патрыятычную акцыю «Маёй краіне» было відаць і чуваць здалёк. Іграла музыка, самадзейныя спевакі прадпрыемства «Гарэлектратранспарт» стваралі настрой гамяльчанам, многія з якіх тут жа, на адкрытай пляцоўцы, пачыналі танцаваць. Прэс-сакратар Гомельскага абласнога камітэта «БРСМ» Арцём Карпенка гаворыць, што падобныя акцыі праходзяць у гэты час на тэрыторыі ўсёй вобласці:

— Дарэчы, мы на сваіх пікетах не толькі агітуем за кандыдатаў, але і даём розную актуальную інфармацыю. Напрыклад, пра бяспечныя паводзіны на вадзе. Увогуле ж людзі падыходзяць, цікавяцца біяграфіямі кандыдатаў, а потым прымаюць рашэнне: ставіць подпіс ці не.

Пікеты па зборы подпісаў на Гомельшчыне маюць права арганізоўваць 57 ініцыятыўных груп. У параўнанні з папярэднімі парламенцкімі выбарамі ў іх цяпер значна больш магчымасцяў. Мясцовыя ўлады толькі вызначылі пералік некаторых месцаў, дзе нельга арганізоўваць пікеты, што аўтаматычна дае права праводзіць гэту работу практычна паўсюдна.

Цяпер у Гомельскай вобласці акрэдытавана амаль 100 назіральнікаў за парламенцкімі выбарамі. Старшыня абласной тэрытарыяльнай камісіі Мікалай Стош гаворыць, што самымі актыўнымі арганізацыямі сталі БРСМ, Беларускі Хельсінкскі Камітэт, РГА «Белая Русь», Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

■ Экалогія

ЗА ЧЫСТАЕ ПАВЕТРА

Еўрапейскі саюз выдзеліць нашай краіне 14,5 млн еўра на рэалізацыю прыродаахоўных мерапрыемстваў

Пагадненне аб фінансаванні праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Паляпшэнне якасці паветра і кіраванне навакольным асяроддзем у Беларусі» паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Еўрапейскім саюзам падпісалі міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА і кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Рэспубліцы Беларусь Андрэа ВІКТАРЫН.

Праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі, бюджэт якога — 14,5 млн еўра, прадугледжвае рэалізацыю мерапрыемстваў, накіраваных на аказанне падтрымкі Беларусі ў правядзенні эфектыўнага маніторынгу выкідаў у атмасферу і радыяцыйнага маніторынгу, удасканаленне кіравання навакольным асяроддзем, мадэрнізацыю інфраструктуры маніторынгу якасці паветра і радыяцыйнага маніторынгу, паляпшэнне экалагічнага кіравання на мясцовым узроўні.

Па словах Андрэа Віктарын, многія выпадкі хвароб і заўчаснай смерці звязаны з забруджваннем паветра, якое, зразумела, не мае межаў. Таму Еўрапейскі саюз зацікаўлены ў ажыццяўленні гэтай праграмы як на карысць беларусаў, так і на карысць людзей, якія жывуць побач, у тым ліку і ў ЕС.

— Праект прадугледжвае як супрацоўніцтва паміж еўрапейскімі і беларускімі экспертамі для абмену досведам, так і пастаўкі абсталявання на суму каля 7 млн еўра, у тым ліку мабільных і стацыянарных станцый для маніторынгу забруджвання паветра, — паведаміла кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі.

Андрэй Каўхута таксама падкрэсліў, што супрацоўніцтва з Еўрасаюзам вельмі важнае для нашай краіны. І яно выяўляецца не толькі ў выдаткоўванні значных па аб'ёме сродкаў, але і ў выкарыстанні сучаснага абсталявання, тэхналогій, якія забяспечваюць паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя і якасці жыцця беларускага народа. Многія сумесныя праекты ўжо рэалізаваны ў нашай краіне.

Падпісанне фінансавага пагаднення — гэта толькі першы крок, пачатак вялікай працы. Наступным этапам стане распрацоўка дакумента праекта — з канкрэтызацыяй усіх мерапрыемстваў, што пералічаны ў фінансавым пагадненні.

Вераніка КОЛАСАВА. *kolasava@zviazda.by*

Жыццё як узор

Цырымонія ўшанавання ў сувязі са 100-гадовым юбілеем ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза Васіля Мічурына адбылася ў Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Павіншаваць юбіляра прыйшлі намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля Качанава, памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па горадзе Мінску Аляксандр Якабсон, старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Румак, памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Аляксандр Гура, а таксама прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, маладзёжных рухаў.

Звяртаючыся да галоўнага героя ўрачыстасці, Наталля Качанава назвала мерапрыемства знакавай падзеяй у жыцці Беларусі. «Ваша жыццё з'яўляецца прыкладам самаахвярнай любові і адданасці свайму народу. Вы заўсёды былі прыкладам для пераймання. Прыміце падзяку ад нас за патрыятычнае выхаванне моладзі», — сказала віцэ-прэм'ер.

Васіль Сяргеевіч Мічурын нарадзіўся 28 ліпеня 1916 года. Палкоўнік у адстаўцы, легендарная асоба. Падчас Зімовай вайны ў Фінляндыі кулямётчык Мічурын у адзіночку на працягу некалькіх гадзін адбіваў атакі праціўніка. За гэты подзвіг яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Затым чатыры гады ваяваў на палях Вялікай Айчыннай вайны, атрымаў цяжкае раненне. У складзе Першага Беларускага фронту вызваляў родную зямлю, удзельнічаў у штурме Берліна.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

УВАГА, ПРАМАЯ ЛІНІЯ!

У наступны аўторак, 2 жніўня, пройдзе «прамая лінія» з **намеснікам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аленай Іванаўнай РАДЧАНКАЙ**. Задаць пытанні па тэме ў гэты дзень можна будзе з 10 да 12 гадзін па нумары 284 89 64.

САБРАНЫ ДРУГІ МІЛЬЁН ТОН ЗБОЖЖА

Як паведамляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, гэты рубеж айчынныя гаспадаркі пераадолелі ўчора.

На першым месцы па сабраным ураджаі па-ранейшаму застаюцца аграрыі Гомельшчыны. Там намалацілі ўжо больш за 515 тысяч тон. Крыху адстае Мінская вобласць: у прысталічным рэгіёне ўбралі 497 тысяч тон. Не нашмат адстае і Брэстчына, дзе сабралі 472 тысячы тон збожжа. А вось у іншых рэгіёнаў харчовая статыстыка пакуль больш сціплая. Прамежкавы вынік аграрыяў Гродзеншчыны — 277 тысяч тон. Гаспадаркі Магілёўскай вобласці запісалі на свой рахунак 181 тысячу тон збожжа. Віцебская вобласць, якая традыцыйна пачынае жніво апошняй, цяпер мае ў распараджэнні 67,7 тысячы тон. Ураджайнасць збожжа складае 34,4 цэнтнера з гектара. Гэта больш за леташні паказчык на 2,3 ц/га.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

ПАКУЛЬ БЕЗ КАМІСІІ

Беларусбанк прадоўжыў да 1 кастрычніка тэрмін бясплатных наяўных плацяжоў

Нядаўна Беларусбанк паведамляў пра тое, што з першага жніўня будзе ўводзіцца камісія за аплату гатоўкай. Яна складзе адзін дэнамінаваны рубель. У канчатковым выніку падобны крок вырашылі адкласці на некалькі месяцаў.

У банку паведамілі, што камісія будзе прымацца з 1 кастрычніка. За гэты час кліенты банка могуць асвоіць працу з інфакіёскамі і навучыцца карыстацца каналамі дыстанцыйнага абслугоўвання, каб мець альтэрнатыву аплаты гатоўкай з камісіяй.

А вось плату за прагляд у банкаматах іншых банкаў балансу на картцы 1 жніўня Беларусбанк, згодна з размешчанай на яго сайце з 1 жніўня інфармацыяй, уводзіць. У тэрміналах Белаграпрамбанка, БПС-Сбербанка і Белінвестбанка ў залежнасці ад валюты рахунку плата складзе 10 капеек / $0,1 (еўра) / 5 расійскіх рублёў, у тэрміналах іншых банкаў-рэзідэнтаў — 50 капеек / $0,3 (еўра) / 20 расійскіх рублёў, у тэрміналах банкаў-нерэзідэнтаў — Br1 / $0,5 (еўра) / 35 расійскіх рублёў.

У Беларусбанку звяртаюць увагу, што зняцце наяўных грашовых сродкаў у банкаматах Белаграпрамбанка, БПС-Сбербанка, Белінвестбанка ажыццяўляецца без спагнання ўзнагароджання.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ЭКАЛАГІЧНА І ЭФЕКТЫЎНА

У раёне былога аэрадрома ў Шчучыне ўвялі ў эксплуатацыю сонечную электрастанцыю магутнасцю 2,5 МВт.

Гэта ўжо другая станцыя па выкарыстанні энергіі сонца ў раёне. Першая, магутнасцю 1,26 МВт, эфектыўна працуе ў вёсцы Ражанка. Не менш карыснай будзе і электрастанцыя ў Шчучыне, якую на плошчы 5 гектараў пабудавалі сумесна з нямецкімі спецыялістамі дзякуючы інвестыцыям у суме больш як 52 мільярды недэмінаваных рублёў. Згодна з ацэнкай **дырэктара ТАА «ЛагАл-Энерга» Аляксандра АЛЕЙНІКАВА**, штогод яна можа вырабляць каля 2,75 мільёна кілават-гадзін электраэнергіі. Калі параўноўваць з электрастанцыяй, якая выкарыстоўвае вугаль, то для атрымання такога ж выніку неабходна спаліць 1750 тон гэтай сыравіны.

Дарэчы, Шчучыншчына будзе ўмацоўваць свае лідзіруючыя пазіцыі ў вобласці па развіцці зялёнай энергетыкі. Нядаўна на тэрыторыі раёна адвялі яшчэ два ўчасткі для будаўніцтва сонечных электрастанцый.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

У ПАМЯЦЬ АБ ШАРЛІ ДЭ ГОЛІ

Установяць мемарыяльную дошку ў Шчучыне.

Славуты француз Шарль дэ ГОЛЬ з ліпеня па верасень 1916 года знаходзіўся ў Шчучыне. Дакументы, якія пацвярджаюць гэта, знайшоў саветнік па эканамічных пытаннях пасольства Францыі ў нашай краіне Мішэль Канціні.

Мішэль КАНЦІНІ і пісьменнік, гісторык Вячаслаў БАНДАРЭНКА пабывалі ў Шчучыне, каб адшукаць месца, дзе 100 гадоў таму падчас Першай сусветнай вайны быў у палоне капітан Шарль дэ Голь, які потым стаў генералам і прэзідэнтам Францыі.

Адпаведныя звесткі ёсць у лістах французскага афіцэра Сальмона, які разам з Шарлем дэ Голем знаходзіўся ў палоне. Сальмон пісаў, што іх, 35 афіцэраў, прывезлі ў Шчучын, які знаходзіцца паміж Гродна і Лідай, і ўтрымлівалі ў двухпавярховым цагляным корпусе фабрыкі. Верагодна, гэта адзін з будынкаў, дзе цяпер размяшчаецца цэх аўтатрактарных камплектаў завода «Аўтапровад», а раней знаходзілася піларама князёў Друцкіх-Любецкіх.

Старшыня Шчучынскага райвыканкама Сяргей ЛОЖАЧНІК паведаміў, што на адміністрацыйным будынку завода «Аўтапровад» неўзабаве плануецца ўстанавіць мемарыяльную дошку ў памяць аб знаходжанні тут французскіх афіцэраў, сярод якіх быў Шарль дэ Голь.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіла Іванавіча ДЗЕМЧУКА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Інстытут журналістыкі БДУ выказвае глыбокія спачуванні дацэнту кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Пятру Пятровічу Жаўняровічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.

■ Калі старонкі пажаўцелі...

ЯК ЦЫВІЛІЗАВАНА РАССТАЦЦА СА СТАРЫМІ КНІГАМІ

Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму за папулярнымі і рэдкімі кнігамі без перабольшвання «палявалі» — дастаць сапраўды вартае выданне было цяжка, да таго ж і каштавала такое задавальненне нямала. А сёння нярэдка даводзіцца бачыць жахлівую карціну — цэлыя стосы літаратуры знаходзяць свой апошні прытулак у брудзе на звычайным сметніку. Вядома, здараецца рознае: у некага паміраюць блізкія, пакідаючы дзясяткі кніг, якія ёсць і ў спадчынніка, нехта пераязджае ў новую кватэру, і для старой бібліятэкі там не знаходзіцца месца... Але ці нагода гэта так па-варварску «ўтылізаваць» літаратуру? Ёсць цэлы шэраг спосабаў, якія могуць не толькі даць вашым кнігам новае жыццё, а і папоўніць сямейны бюджэт.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Другасная сыравіна...

Пэўна, самы традыцыйны і звыклы шлях — здача ў макулатуру. Ён падыходзіць, напрыклад, для тых, хто не хоча валэндацца з асобнымі выданнямі. Толькі ў сталіцы дзейнічае амаль дзве сотні стацыянарных і мабільных нарыхтоўчых пунктаў (з поўным іх спісам можна азнаёміцца на сайце Мінгарвыканкама). Праўда, значных грошай на гэтым не зробіш. Сярэдняя цана 1 кілаграма макулатуры вагаецца ў раёне дзесяці капеек. Таму, калі кніг не так шмат, паездка ў нарыхтоўчы пункт можа быць немэтазгоднай нават з эканамічнага пункту гледжання — дзеля таго, каб «адбіць» два квіткі ў грамадскім транспарце, трэба здаць не менш за дзесяць кілаграмаў паперы. З іншага боку, у такіх месцах звычайна прымаюць не толькі макулатуру, а адразу цэлы комплекс адходаў: рыззё, пластык, шклабой і іншае.

Існуе таксама некалькі варыянтаў для тых, хто не хоча займацца самастойнай транспарціроўкай і мае сапраўды маштабныя аб'ёмы папяровых выданняў. Напрыклад, на сайце *макулатура.бел* жыхары Мінска і бліжэйшых населеных пунктаў могуць пакінуць заяўку на самавываз непатрэбных выданняў, ды яшчэ і па «царскім» кошце — ад 12 капеек за кіло. Праўда, арганізацыя патрабуе, каб аб'ём макулатуры быў не меншы за 200 кілаграмаў. На сайце paperstok.by цэны яшчэ вышэйшыя — ад 14 капеек, але прымаюць толькі ад 300 кіло.

Калі ж грашовы аспект вас зусім не хвалюе, то макулатуру можна ўтылізаваць пры дапамозе спецыяльных зялёных кантэйнераў — такія ўжо амаль паўтара года размяшчае ў спальных раёнах сталіцы ААТ «Белгіпс». Галоўная «фішка» ў тым, што выкідаць у такія сметнікі можна абсалютна любыя папяровыя і кардонныя адходы — супрацоўнікі прадпрыемства самі займаюцца іх сартаваннем. Актуальныя кнігі пасля перадаюць у сацыяльныя ўстановы, астатняе адпраўляюць на перапрацоўку. Адзінае, аб чым просяць уласнікі кантэйнераў, — перавязваць ці ўпакоўваць выданні ў цэлафан, бо здараюцца выпадкі, калі нехта па няведанні ці злым намеры выкідае ў кантэйнеры рэчы, якія могуць сапсаваць літаратуру.

...або крыніца ведаў?

А вось калі кнігі для вас — не проста нарэзаная папера з надрукаванымі фарбай літарамі, то варыянтаў працягу іх жыцця некалькі. Самы бескарыслівы і сучасны — «вызваліць» літаратуру шляхам буккросінгу. Рух па перадачы прачытаных кніг іншым людзям з'явіўся 15 гадоў таму і ўжо перажыў свой пік, але дагэтуль застаецца папулярным. Ідэя ў тым, што гаспадар рэгіструе непатрэбную яму кнігу на сайце (у Беларусі гэта bookcrossing.by), дзе яна атрымлівае спецыяльны нумар — BCID, які трэба пазначыць на форзацы. Пасля гэтага выданне можна пакінуць у любым грамадскім месцы, дзе яе знойдзе іншы чытач, які пазней паўторыць працэдуру. А першапачатковы гаспадар зможа адсочваць яе падарожжа і нават знаёміцца з тымі, каму кніга трапіла ў рукі.

Мяркуючы па згаданым сайце, толькі цяпер у Мінску гэтак вандруе амаль тры тысячы выданняў. Але калі вы спыніцеся якраз на варыянце з буккросінгам, майце на ўвазе, што тэлефонныя даведнікі, падручнікі па гісторыі КПСС і іншыя кнігі падобнага кшталту наўрад ці будуць карыстацца папулярнасцю.

Калі ж расставацца з літаратурай бясплатна не хочацца, то вам прамая дарога ў букіністычныя крамы і аддзелы. У такіх месцах кнігі ацэняць, выставяць на продаж, а пасля рэалізацыі частку прыбытку (звычайна 70%) аддадуць былому гаспадару. Праўда, возьмуць на гандлёвыя паліцы далёка не ўсё. Як нам патлумачылі ў букіністычным аддзеле Дома кнігі «Веды», ахвотным трэба папярэдне скласці спіс усёй літаратуры, якую яны хочуць прадаць, і прыйсці з ім у краму. Спецыялісты выберуць кнігі, у якіх ёсць шанц знайсці новага гаспадара, і толькі потым выданні прымуць да рэалізацыі. Кошт залежыць пераважна ад стану кнігі.

У першую чаргу ў букіністычныя аддзелы нясуць падпісныя шматтомныя выданні, за іх можна атрымаць больш-менш сур'ёзныя грошы. Так, напрыклад, збор твораў Чэхава ў 12 тамах 1964 года ці 9-томнік Буніна 1965 года ў добрым стане забяруць за 15 рублёў, 5-томнік Сервантэса 1965-га пацягне ўжо на 20 рублёў, а за заўсёды папулярнага Заля ў 26 тамах 1960 года можна атрымаць і ўсе 50. З іншага боку, некаторыя кнігі, папулярныя ў СССР, але не вельмі цікавыя цяперашняй публіцы (аўтараў кшталту Новікава-Прыбоя), наўрад ці возьмуць у букіністычны аддзел. Адзіночныя выданні таксама прымаюць, але па меншых цэнах. Сярэдні кошт адной кнігі ў добрым стане — каля 2 рублёў.

Асобна можна весці размову пра антыкварную літаратуру. Калі раней мяжой, якая раздзяляла антыкварыят і старызну быў 1850 год, то цяпер гістарычную каштоўнасць набываюць нават кнігі, выдадзеныя да Вялікай Айчыннай вайны, сцвярджаюць у «Ведах». Калі ў вас раптам захаваліся непатрэбныя цікавыя кнігі пачатку мінулага стагоддзя — абавязкова варта паказаць іх спецыялістам у букіністычных аддзелах, бо за некаторыя можна атрымаць вельмі немалую ўзнагароду.

Апошні, але самы меркантыльны спосаб — продаж кніг праз інтэрнэт-аўкцыёны. У такім выпадку вам не прыйдзецца дзяліцца грашыма з пасярэднікамі, але і займацца ўсімі пытаннямі давядзецца самастойна. Ці сур'ёзным будзе выйгрыш у грашах? Далёка не факт. Напрыклад, самая папулярная стартавая стаўка на выданні другой паловы мінулага стагоддзя — 50 капеек. Зноў жа, далёка не на ўсе такія лоты адгукаюцца пакупнікі. Затое новыя ці амаль новыя кнігі тут можна прадаць даволі выгадна — амаль па магазінных цэнах. Так, толькі 12 кніг з 25-томнага збору твораў Уладзіміра Караткевіча 2012 года выстаўлены на продаж за 240 рублёў. 6 кніг з «Залатой калекцыі беларускай літаратуры» ў 50 тамах — за 80. Пэўна, найвялікшым попытам на такіх пляцоўках карыстаецца ўжо згаданая антыкварная літаратура. Так, напрыклад, за псалтыр эпохі расійскага імператара Мікалая I у «прымальным» стане просяць 37 рублёў, за «Пачатковую алгебру» 1970 года — 50 рублёў, столькі ж за асобны 5 том слоўніка Бракгаўза і Эфрона 1891 года...

Што рабіць з непатрэбнай літаратурай — выбар кожнага. Але перад тым, як апошні раз зняць кнігу з паліцы, заўсёды варта праверыць яе на прадмет грашовых «укладаў». А яшчэ лепш — пагартаць старонкі і перапытаць сябе, ці сапраўды вы гатовы расстацца з тым, што некалі так дорага даставалася?

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

ШТО БУДЗЕМ ЕСЦІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А для таго, каб чагосьці не аказалася ў празмернай колькасці або ў дэфіцыце, прырода прадугледзела шматлікія механізмы ператварэння адных кампанентаў ежы ў іншыя. Калі не хапае асноўнага энергетычнага «паліва» — вугляводаў — арганізм сінтэзуе іх з бялкоў або тлушчаў; адзін від амінакіслот пераводзіць у іншыя, самастойна ўмее сінтэзаваць многія тлушчавыя, вугляводныя і бялковыя кампаненты; лішак вугляводаў пераводзіць у тлушчы, лішак бялкоў — у вугляводы, нуклеінавыя кіслоты і мачавую кіслату і г.д. Аднак пры працяглым лішку або дэфіцыце тых ці іншых кампанентаў харчавання прыстасавальніцкія механізмы знясільваюцца, і ў чалавека пачынаюцца розныя праблемы са здароўем, якія на медыцынскай мове называюцца аліментарна-залежнымі, звязанымі з харчаваннем. У гэтым сэнсе **харчаванне сярэднестатыстычнага беларуса вельмі далёкае ад здаровага, бо вылучаецца высокай каларыйнасцю, празмерным спажываннем жывёльных тлушчаў і цукру пры недахопе якаснага жывёльнага бялку і клятчаткі з агародніны і фруктаў**. Як вынік — высокі ўзровень усяго спектра аліментарна-залежных захворванняў. І на першым месцы ў структуры смяротнасці нашага насельніцтва менавіта гэтыя захворванні — сардэчна-сасудзістыя і анкалагічныя.

— Для чаго нам патрэбны клятчатка, баласныя рэчывы, і як зразумець, колькі неабходна менавіта табе?

— Аснову здаровага харчавання складаюць вугляводы — маю на ўвазе ўсё, што расце. Расліны выкарыстоўваюць энергію сонца для сінтэзу вугляводаў, такім чынам, калі мы ўжываем расліны, то спажываем сонечную энергію. Толькі расліны здольныя сінтэзаваць вугляводы. Ні жывёлы, ні чалавек на гэта не здольны. Клятчатка — гэта абалонка клетак раслін. У арганізме чалавека няма ферментаў, якія маглі б расшчапляць клятчатку, затое такія ферменты ёсць у кішэчнай мікрафлоры, тоўстай кішцы. Без кішэчных мікраарганізмаў чалавек жыць не можа — гэта ўжо даўно было даказана навукай. Кішэчныя мікробы выконваюць некалькі важных функцый: пастаянна трымаюць у баявой гатоўнасці наш імунітэт; сінтэзуюць звыш дзясятка незаменных кампанентаў жыццядзейнасці; падсілкоўваюць клеткі тоўстай кішкі і г.д. **Без клятчаткі кішэчныя мікраарганізмы проста прападуць, іх жыццядзейнасць парушыцца, і, адпаведна, парушыцца жыццядзейнасць усяго арганізма.** Таму да мікробаў трэба ставіцца паважліва і абавязкова забяспечваць іх ежай, неабходнымі ім рэчывамі, у прыватнасці клятчаткай або харчовымі валокнамі. Яны ў вялікай колькасці змяшчаюцца ў збожжавых, агародніне, фруктах, асабліва ў абалонцы зерня і лупінах. Вось чаму так важна ўжываць неачышчаныя, нерафінаваныя прадукты: кашы з неачышчаных круп, шматкоў з плюшчанага зерня, цэльназерневы хлеб, плады з лупінай... Калі такой ежы ў рацыёне недастаткова, дэфіцыт клятчаткі можна аднавіць, дадаючы ў стравы прамыслова выкрабленае вотруб'е або клятчатку. Дарасламу дастаткова 25-35 г клятчаткі ў суткі.

— У якіх працэсах удзельнічаюць вітаміны і мікраэлементы? Ці ёсць шанц атрымаць іх з ежай?

— У ежы, акрамя асноўных спажыўных кампанентаў (нутрыентаў), змяшчаюцца яшчэ і такія рэчывы, якія патрэбны арганізму ў вельмі невялікай колькасці — іх называюць мікранутрыентамі. Гэта вітаміны і мінеральныя рэчывы. Мікранутрыенты з'яўляюцца складовай часткай ферментаў, гармонаў, удзельнічаюць у многіх біяхімічных рэакцыях абмену рэчываў, таму з'яўляюцца абсалютна неабходнымі для жыцця. Большасць мікранутрыентаў у арганізме чалавека не выпрацоўваюцца, а паступаюць з ежай і вадой. Працяглы дэфіцыт асобных мікранутрыентаў або пастаяннае іх празмернае паступленне выклікае цяжкія наступствы. Самы вядомы прыклад — дэфіцыт ёду, у выніку чаго развіваецца парушэнне функцыі шчытападобнай залозы і — як следства — парушэнне росту, развіцця, разумовая адсталасць. Таму **на сучасным этапе даследаванне мікраэлементнага складу арганізма чалавека набывае такое ж значэнне, як правядзенне электракардыяграфіі або флюараграфіі.**

— Якія вонкавыя прыкметы будуць указваць на дэфіцыт нейкіх мікранутрыентаў?

— Прыкметы могуць быць вельмі разнастайнымі, але добры ўрач заўсёды іх убачыць. Самыя відавочныя прыкметы — гэта «цвіценне» і крохкасць пазногцяў, павышанае выпадзенне валасоў, сухасць скуры, схільнасць да прастуд, хуткая стамляльнасць, парушэнне сну, праблемы са страваваннем, алергічныя праявы, павышаная кроватачывасць дзяснаў, у жанчын — нерэгулярны цыкл.

Вопытны ўрач, распытаўшы пацыента, можа накіраваць яго на даследаванне ўзроўню біяэлементаў, тым больш цяпер ёсць рэальная магчымасць вызначыць узровень біяэлементаў у арганізме па аналізе валасоў. Такі аналіз робяць цяпер і ў Мінску, у лабараторыі «SOL-instruments».

Фота Надзеі БУЖАН.

— Чаму многія замежныя і айчынныя спецыялісты пачалі актыўна выступаць супраць штучных вітамінаў? Ці ёсць для арганізма прынцыповая розніца, якія вітаміны спажываць — натуральныя або штучныя?

— Паколькі мікранутрыентны дэфіцыт быў вядомы даўно, у медыцынскую практыку трывала ўвайшлі рэкамендацыі аднаўлення дэфіцыту вітамінамі і мінеральнымі дабаўкамі. Задоўга да з'яўлення медыцынскіх вітамінных прэпаратаў цынгу лячылі лімонным сокам або настоем хвоі, «курыную слепату» — гогалемогалем з малаком, а рахіт — пясочнымі і сонечнымі ваннамі. Усім добра вядомыя цудадзейныя пазбаўленні ад хвароб з дапамогай траваў, а гэта і ёсць класічная карэкцыя мікраэлементнага дысбалансу. Але фарміндустрыя прапанавала альтэрнатыўны, больш даступны варыянт — шырокі спектр самых разнастайных штучных вітамінных і мінеральных прэпаратаў, якія ў выніку раскручанай рэкламы пачалі прызначаць усім без разбору, па прынцыпе «горш не будзе», «на ўсякі выпадак». Даход ад продажу вітамінаў, мінеральных і іншых дабавак і сёння вылічваецца мільярдамі долараў. Аднак медыцынская навука не стаіць на месцы, і з цягам часу стаў відавочным той факт, што вітаміны, як і іншыя фармакалагічныя прэпараты, не варта прызначаць «на ўсякі выпадак». Акрамя таго, **было даказана, што з натуральных харчовых прадуктаў або натуральнай раслінай сыравіны (травы, плады, насенне, сок, пылок і г.д.) мікранутрыенты засвойваюцца арганізмам больш эфектыўна.** Гэта звязана з тым, што адладжаныя стагоддзямі прыродныя механізмы засваення рэчываў настроены на іх натуральнае паходжанне, а любая «хімія» патрабуе нейкіх новых шляхоў перапрацоўкі і засваення. Таму нярэдка штучныя вітамінныя прэпараты аказваюцца неэфектыўнымі. Адсюль выснова: без яўнай неабходнасці прымаць вітамінна-мінеральныя комплексы не варта — вынік будзе нулявы. Аднак калі ёсць прыкметы вітамінна-мінеральнага дэфіцыту, то выкарыстоўваць лепш дабаўкі з натуральнай сыравіны, пры іх адсутнасці — звычайныя вітамінна-мінеральныя комплексы таксама акажуць станоўчы эфект, але самае важнае — аптымізаваць харчаванне, ужываць разнастайную ежу, выкарыстоўваць свежае зеляніва, дадаваць у ежу насенне, спецыі з натуральных кампанентаў.

— Ці можа нейкі асаблівы спосаб харчавання спрыяць нашай маладосці і даўгалецціу? Якія прадукты і харчовыя паводзіны гэтаму перашкаджаюць?

— Працягласць жыцця чалавека як віду Homo sapiens, на мой погляд, і без таго немалая і налічвае 110-120 гадоў. Пры гэтым сярэдняя працягласць жыцця сярэднестатыстычнага беларуса прыкладна 72 гады, гэта азначае, што кожны чалавек у нашай краіне мае рэзерв жыцця, роўны прыкладна 50 гадам. Іншымі словамі, **запаволіць працэсы старэння і працягнуць жыццё з дапамогай правільнага харчавання і актыўнага ладу жыцця — задача абсалютна рэальная і па сілах кожнаму.** Празмернае спажыванне тлушчаў, цукру і солі, лішняя вага, нізкая фізічная актыўнасць, курэнне, алкаголь, няўменне спраўляцца са стрэсавымі сітуацыямі скарачаюць жыццё значна мацней, чым любыя знешнія ўздзеянні.

Працэс старэння ў арганізме запраграмаваны на генетычным узроўні. Кожная клетка мае свой тэрмін жыцця і свой рэзерв нараджэння сабе падобных. Калі гэты рэзерв вычэрпваецца, арганізм паміраe. Працэс абмену рэчываў і атрымання арганізмам энергіі заключаецца ў акісленні нутрыентаў, для чаго патрэбны кісларод. У працэсе біяхімічных рэакцый утвараюцца так званыя свабодныя радыкалы — агрэсіўныя формы кіслароду, яны вельмі актыўныя і разбуральна ўздзейнічаюць на клеткі. У арганізме ёсць уласныя механізмы абароны ад свабодных радыкалаў — гэта так званыя антыаксіданты. Для іх функцыянавання неабходны вітаміны А, Е, С, а таксама такія мікраэлементы, як селен, цынк, медзь, марганец. Натуральныя антыаксіданты чалавек атрымлівае з ежай, вадой і паветрам. Але **ніводнае з пералічаных рэчываў не валодае самастойным антыаксідантным дзеяннем, толькі ў комплексе ўсе яны запавольваюць старэнне і падаўжаюць актыўнае жыццё.** Вось чаму так важна харчавацца разнастайна — каб забяспечваць паступленне ў арганізм шырокага спектра розных нутрыентаў.

— Колькі вады неабходна арганізму? Якой яна павінна быць — ачышчанай з дапамогай фільтраў і сістэмы адваротнага осмасу, бутыляванай, мінеральнай?

— Усе біяхімічныя рэакцыі ў арганізме адбываюцца ў водным асяроддзі, таму дастатковы водны баланс абсалютна неабходны. За суткі чалавек губляе да 2 л вадкасці з дыханнем, потам, мачой і фекаліямі. Гэтыя страты трэба аднаўляць. Шмат вады змяшчаецца ў харчовых прадуктах: у тварагу — да 80%, вараным мясе — да 40%, я ўжо не кажу пра вадкія стравы — суп, чай... Так што палова, а тое і больш неабходнай вады паступае ў арганізм з ежай, таму чыстай пітной вады неабходна не больш за 1 л у суткі. Вядома, трэба ўлічваць, што ў спёку ці пры вялікіх фізічных нагрузках вады можа спатрэбіцца і да 5 л у суткі.

Што да якасці пітной вады, то лепш за артэзіянскую не знайсці. **Неабходна выкарыстоўваць натуральную ваду, якая змяшчае розныя солі — яны вельмі важныя для арганізма.** Калі доўгі час карыстацца фільтраванай вадой, гэта прывядзе да дэфіцыту многіх хімічных элементаў, і тады давядзецца прымаць мінеральныя дабаўкі.

Піць ваду трэба тады, калі хочацца, пры гэтым абсалютна не важна, будзе гэта да, падчас або пасля прыёму ежы. На страваванні гэта ніяк не адаб'ецца. Тым не менш у нашай культуры заведзена ўжываць чай, каву, кампоты, кісялі пасля асноўных страў.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

Сэрвіс уздоўж дарогі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— За апошнія гады аб'екты харчавання значна змяніліся. Магчыма, дзякуючы і патрабаванням заканадаўства, якія прад'яўляюцца і да посуду, і да шыльдаў, і да камфортнасці паслуг. Павышаецца таксама культура абслугоўвання ў іх, — зазначыла **Ларыса КАМАРОВА, начальнік аддзела арганізацыі грамадскага харчавання Міністэрства гандлю Беларусі.** — Адкрываецца шмат новых пунктаў, але шмат і закрываецца. Па прычыне змены напрамку дарогі, напрыклад, або сам уладальнік разумее, што не сваёй справай заняўся. Акрамя таго, гэтаму садзейнічае спажывец, які едзе туды, дзе яму смачна.

Асартымент сёння кожны ўладальнік прыдарожнага пункта вызначае сам, арыентуючыся на густ спажыўца і свае фінансавыя магчымасці. Нават калі ў наяўнасці будзе адзін суп, але смачны, гэта будзе лепш, чым шырокі пералік, стравы з якога будуць недастаткова якаснымі. Пры гэтым немалаважна, каб чалавека сустракалі ветліва, з усмешкай, тады і аб'екты харчавання, гаспадарамі якіх у большасці з'яўляюцца прыватныя асобы, не толькі выжывуць, але і зацвердзяцца на рынку надоўга. Тым больш што з мэтай далейшага развіцця грамадскага харчавання і паляпшэння яго якасці плануюцца далейшая лібералізацыя і спрашчэнне дзейнасці суб'ектаў харчавання.

Для караванераў створаць дадатковыя ўмовы

Замежных караванераў — тых, хто падарожнічае па свеце на ўласных аўто з прычэпамі-дамамі, вырашылі падтрымаць у Беларусі на ўзроўні Мінспорту і турызму і Мінтранспарту і камунікацый. Для такіх турыстаў некаторыя аўтазапраўкі і санітарныя збудаванні, якія плануецца ўзвесці, будуць абсталяваны спецыяльнымі прыладамі для забору вады, зліву нечыстот і электрычнай зарадкі акумулятараў.

За апошнія некалькі гадоў, дарэчы, за кошт бюджэту на беларускіх дарогах міжнароднага ўзроўню з'явілася ўжо 21 сучаснае санітарнае збудаванне. Яны адпавядаюць усім еўрапейскім нормам: тут да паслуг спажыўца кругласутачны бясплатны цёплы туалет, спавівальны пакой, а ў некаторых нават душ. Побач яшчэ аўтазапраўка і крамы. Пры сёлетняй рэканструкцыі дарогі М6 Мінск—Гродна запланавана пабудаваць яшчэ адзін санітарны аб'ект такога ўзроўню.

— Караванерства — перспектыўны напрамак для развіцця ў Беларусі, бо ў нас шмат азёр і лясоў і ёсць што паглядзець, — зазначыў **Сяргей ЛЯВОНЧЫК, намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог — начальнік аддзела ўтрымання аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі.** — Сёлета мы таксама вырашылі паглядзець на дарожны сэрвіс з пункту гледжання спажыўца і вывучыць грамадскую думку праз два варыянты анкет: для кіроўцаў і ўладальнікаў кавярняў, аўтазаправак пры дарозе. Кожны можа даслаць свае меркаванні, выказацца: што падабаецца, што патрэбна зрабіць, што кепска.

Тым не менш чалавеку трэба не толькі добра ехаць і мець магчымасць адпачыць пры дарозе, але яшчэ і ведаць, куды яму кіравацца. 823 дарожныя знакі з выявамі выдатных мясцін на карычневым або сінім фоне змешчаны сёння на ўсіх буйных аўтадарогах краіны.

— Такія таблічкі — гэта беларускі стандарт, які адпавядае еўрапейскай традыцыі, — дадаў прадстаўнік Мінтрансу. — Мы хочам прывучыць людзей ездзіць не па паняццях, а па знаках, картах і навігатарах, каб гэта рабілася цывілізавана.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

На беларускіх дарогах размешчана 556 аб'ектаў грамадскага харчавання, больш за 400 аб'ектаў гандлю, 77 пунктаў тэхнічнай дапамогі, 40 аўтамыек, 88 ахоўных стаянак і 70 гасцініц.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сяргей МАЦКЕВІЧ:

«Ніводзін наш спартсмен у Рыа не будзе абдзелены ўвагай»

Трансляцыя Алімпіяды-2016 стане галоўнай тэлевізійнай падзеяй жніўня

Пра тое, хто будзе расказваць нам пра спорт і як журналісты рыхтуюцца да такой грандыёзнай падзеі, мы запыталіся ў загадчыка каментатарскага аддзела галоўнага спартыўнага тэлеканала краіны Сяргея МАЦКЕВІЧА.

Трансляцыю найбуйнейшага спартыўнага форуму будуць весці тэлеканалы «Беларусь 1», «Беларусь 2» і «Беларусь 5». Белтэлерадыёкампанія традыцыйна забяспечыць максімальна шырокае асвятленне галоўнага турніру чатырохгоддзя. У Рыа-дэ-Жанэйра будуць працаваць 35 прадстаўнікоў медыяхолдынга. Акрамя трансляцый саміх спаборніцтваў, пра самыя цікавыя і захапляльныя моманты Гульняў гледачам распавядуць «Дзённікі Алімпіяды», падрыхтаваныя Агенцтвам тэленавін. Яны будуць выходзіць два разы на дзень з 5 жніўня. Раніцай у кароткіх дзённіках з'явіцца аператыўная інфармацыя аб спаборніцтвах, якія пройдуць для беларусаў ноччу (з-за розніцы ў часе з Бразіліяй). Больш падрабязнымі і грунтоўнымі стануць вячэрнія дзённікі — пасля «Панарамы» на «Беларусь 1». Штодзённы аб'ём алімпійскага вяшчання па ўсіх каналах медыяхолдынга складзе каля 33 гадзін у суткі, а агульны аб'ём — больш за 500 гадзін.

— На час Гульняў тэлеканал «Беларусь 5» становіцца кругласутачнай алімпійскай крыніцай інфармацыі, — гаворыць **Сяргей Мацкевіч.** — Прыкладна 20 гадзін з 24, якія ёсць у сутках, штодня будзе весціся вяшчанне. Алімпійскую праграму будуць «разводзіць» толькі трансляцыі футбольнай Лігі чэмпіёнаў (раўнд плэй-оф), хакейнай Лігі чэмпіёнаў (дзе будзе гуляць мінскае «Юнацтва»), чэмпіяната Беларусі па футболе і Кубка краіны па хакеі.

